УДК 82.09 (476)

# ПАЭТ І БОГ. ХРЫСЦІЯНСКІЯ МАТЫВЫ ПАЭЗІІ А. СЫСА

***канд. філал. навук, дац. Н.Б. ЛЫСОВА***
***(Полацкі дзяржаўны універсітэт)***

*У артыкуле разглядаецца такі феномен сучаснай беларускай паэзіі, як паэзія Анатоля Сыса. Зроблены высновы аб пераемнасці ў паэзіі Сыса адраджэнскай традыцыі сінтэзу рэлігійнага, сацыяльнага, нацыянальнага і інтымнага пачуццяў. Вызначаны сімвалічны рад экзістэнцыяльнага вопыту паэта, а таксама характэрныя тэматычныя і жанравыя варункі творчасці.*

Хрысціянская тэма становіцца адной з вядучых тэм нацыянальнай літаратуры як паэзіі, так і прозы. Вершы, раманы, анталогія [1]. Працэс натуральны, бо рэлігійнае і творчае светаўспрыманне маюць аднолькавы падмурак - пачуццёвы. Аднак у час інтэлектуальна-філасофскай літаратуры і адраджэння інстытутаў царквы «трашчыць» падмурак і паэтычнага пачуцця і абсурднай веры.

Верш Анатоля Сыса трапіў у названую вышэй анталогію, але суадносіць яго паэзію з хрысціянскай тэмай ніхто не адважваецца, мо таму, што ён самая адыёзная і нефармальная постаць нашай паэзіі. Не з нагоды стылістычных пошукаў, а з нагоды - жыццёвых паводзін.

У той жа час Анатоль Сыс - самы традыцыйны паэт беларускай сучаснай літаратуры. Такая характарыстыка яго паэзіі - ў асабістым накірунку, больш скіраваным да традыцый фальклорна-песеннага і інтымна-лірычнага паэтычнага споведу. Здаецца, гэтыя прынцыпы закладзены класікамі беларускай літаратуры ад Лучыны і Багушэвіча. Але паэт Сыс фіксуе сучасны фальклор, ці новае рэлігійнае пачуццё суайчыннікаў.

На першы погляд, вершы Сыса - апалагетыка хрысціянства. Паэт звяртаецца да класічнага вобраза Бога-сейбіта [2, с. 88], да асабістага Бога ў душы чалавека (138). Інтымная лірыка паэта прасякнута пачуццём веры. Гэта вельмі шчыры маналог аўтара, самабічаванне. Паэт знаходзіцца паміж д’яблам і Богам - грэшнае цела (ад д’ябла) і чыстая душа (ад Бога). У вершы «Кола» штодзённае выпрабаванне (кола) паэт называе і д’яблавым, і богавым (18). Аўтар выступае хрысціянскім маралізатарам, калі любоў абвяшчае божым дарам («ПеснІ пра каханне», 133 - 140), у процілегласць нянавісці і жорсткасці. Ці дае паэтычную водпаведзь злачынцам, грэшнікам, што «брыдуць на споведзь» (47). Нарэшце, «У шкляным саркафагу», вершы у прозе, падымае пытанне аб наканаванасці жыцця і волі чалавека, і прызнаецца, што яму, аўтару, падабаецца жыць па волі Бога - «у шкляным саркафагу» (20).

На другі погляд, вершы на рэлігійныя тэмы - складаная споведзь паэта, які іграе ролі героя ў хрысціянскай трагедыі, Фантазія паэта разбурае мяжу паміж Богам і чалавекам. І вось ужо паэт існуе ў новазаветнай гісторыі на месцы Хрыста. Вершы «Чацвёрты цвік» (25), «Пайду туды, адкуль прыйшоў...» (24 - 25), «Хто натхніць мяне на смерць?...» (25) напісаны ад першай асобы і быццам бы працягваюць асабістую споведзь аўтара-чалавека: «мае пакуты крыж сабе забраў», «бо я пакінуў цела», «хаця сваю і выпіў чашу. ...Але ў чым мая віна ? Віна майго наканавання? Жыццё - вялікая мана. І толькі смерць яе пазнанне» (24); «Праз пакуты дай мне Бога, дай мне Богавую кроў. ...Ты нахніш мяне на смерць, чалавек, цяжарны Богам, праз цябе мая дарога, моцы дай яе здалець» (25). Адначасова паэт выступае ў ролі Іуды, што хоча ўпіцца ў Бога вуснамі і зубамі (26).

Драматургія пакутаў у паэта будуецца, як барацьба з самім сабой, цела з душой. Дакладней - паляванне цела на душу. Лірычны герой падаецца як паляўнічы і як ахвяра. Тэма ўкрыжавання набывае ў іншых вершах умоўна-метафарычны характар - як тэма пакутаў ці цкавання, Напрыклад, «Крыжавалі крумкача за колер чорны...» (49). Або як тэма чакання прыходу Месіі, Духу, на грэшную зямлю «да тых, хто выплюнуў душу, / хто ў паднябесных храмах / блюзнерствам замяніў імшу, а Святароў на Хамаў» («Бажавоўк» - 50).

Паэтычнае светаўспрыманне Сыса - складаны комплекс масавага рэлігійнага светаўспрымання, дзе сыходзяцца язычніцтва і хрысціянства, у якім высвечваюцца трагедыйны, апакаліпсічны подых жыцця, такі старажытны, з антычных часоў, і надзея на ратаванне праз напружанне волі чалавека або Бога.

Свае светаўспрыманне паэт выдатна малюе ў так званых «прыродных вершах». Так, верш «О Неба» пачынаеццаназіраннем купалоў (з рэлігійнага топаса), працягваецца пратэстам супраць бачанага ці жаданнем шчырасці ў адносінах з вечным («абрыдлі мне храмы абразы рызы»), потым - паэтычным узнясеннем на ўзровень бачання Самога, бачання зямной нявечнасці і, нарэшце, расчараваннем у асабістых ведах, бо немагчыма разгледзіць Яго знакі на зямлі ці чалавечай гісторыі (27).

У светаўспрыманні паэта зямное жыццё - пекла (9). «Жыццё... заўсёды з прожылкам крыві», - гаворыць паэт у вершы з красамоўнай назвай «Апакаліпсіс» (17). А пазямное існаванне - рай. Аўтар параўноўвае могілкі, пагост з раем (8). Гэта супрацьстаўленне паўтараецца як рэха: бяроза і лёд, берасцянае

неба і падлёднае зямное, Сапраўднае існаванне для аўтара - у ачышчальным, нябесным агню. А сам «Агонь» (у аднайменным вершы - 32), зноў вяртае да вобразу неба, дзе гараць свечкі знічак, каля якіх гавеюць душы.

Вельмі часта сустракаецца язычніцкі вобраз - птушак як душ памерлых (вершы «Рай», «Смерць» - 30). Але тут жа прьгсутнічае і хрысціянскае ўзнясенне, ачышчэнне, палёт пасля смерці - І тады ўжо «ні болю, ні пакут, ні страху» (30). Такая ветхазаветная птушка, як воран (у Сыса крумкач, гайворан) выступае як пасрэднік паміж зямлёй і небам, у ролі таго, хто натоліць гэтую зямлю (верш «Смага» - 30 - 31). А гэта ўжо біблейскі сэнс наадварот: ноеў воран шукаў зямлю, гайворан Сыса шукае «вады блакітнай вены» (31).

Таксама пераасэнсаваны ў паэзіі Сыса вобраз ідалаў. Так, у вершы «Капцы» спачатку сцвярджаецца, што самыя жывыя багі - багі дзядоў, а тлумачэнне гэтаму - у іх чалавечнасці. Сёння багі - нежывыя, таму што страчана чалавечнасць, людзі пераўтварыліся ў дрэвы (28). Аўтар быццам бы пераасэнсоўвае гістарычнае ўяўленне Новага свету: спачатку час багоў, потым час волатаў і, нарэшце, час людзей. Ці не пад уплывам эклезіясту трансфармуецца ўяўленне сучаснага паэта, які зноў малюе апакаліпсіс чалавечага роду?! Гісторыя падаецца паэту адыходам ад Бога ці набыццём бесчалавечнасці: «На скрыжаванні сцяжын воўчых і чалавечых крывёй набрыяў бурштын...» (48). Усё часцей канстатуецца наяўнасць сучаснага «і садому і гаморы» (144).

Сутыкненне хрысціянскага і язычніцкага светаўспрымання назіраем і ў вершы «Змяіны Цар» (34), якога паэт называе «гаспадаром», «храмам дуброў замовы» з алтаром «без абразоў і словаў». І ў вершы «Пан Лес», што ўяўляецца аўтару «ажыўленым храмам, які прарос з боскай крыві» і дасылае да вобразу крыжа, «бо смагу спатоліла брата Іюды душой - людская душа» (35).

Адважымся думаць, што язычніцкія погляды паэта звязаны з адчуваннем радавой сувязі з чалавецтвам, нацыяй, сям'ёй. Язычніцтва аўтара- гэта яго любоў да зямнога жыцця, яго грэшная прага жыцця.

У гэтай сувязі адбываецца смелае сінтэзаванне тэмы Бога і тэмы Радзімы. Паэт імкнецца сумясціць надрэальнасць ці звышпрастору з айчыннай прасторай, з рэальнасцю Радзімы. Тут таксама назіраецца ўнутраная барацьба. Яна ў супярэчлівых характарыстыках роднага краю, яго гісторыі. Але гэта барацьба язычніцтва і хрысціянства аўтара, цялеснасці і духоўнасці яго чалавечай натуры.

Таму і характарыстыкі Айчыны можна ўмоўна падзяліць на цялесныя і духоўныя, З аднаго боку, яна - «згвалтаваная мая, босая, мая голая пад дажджом» (130), «босая падчарыца» (11), «жанчына, якую спазнаў» (120), «цяжарная ваўчыца» (11), «маці» (5 ~ 6), «дрымучая бабулька» (11), «жывы чэрэп» (11), «плаха» (129), «мая магіла» (126 - 127). У сваёй цэласнасці гэтыя вобразы ствараюць пакутлівы жыццёвы шлях чалавека.

З другога боку, паняцце Радзімы мае духоўныя сімвалы. І перш за ўсё, сімвал Слова. Так, менавіта, з вялікай літары, таму што паэт атаясамлівае мову і Бога. У «Маналогу Кастуся Каганца» (125) чалавечы горб, які не схаваць (ён заўжды з намі), сімвалізуе мову, матчыну мову, і потым набывае метафарычны рэлігійны сэнс: «І скрозь па шляхох-гасцінцах / вялі гарбуноў закутых / у іншую веру ксціцца, / пад Богам чужым і лютым, / а Бог наш - не ідал з воску, / без племені, без радзімы, / а горб наш прырос - да костак, - / ЁН / БОГ НАШ /І БОГ АДЗІНЫ» (125). Мова матчына - боская, а родная хата - сабор анямелы (4).

Своеасаблівае аб'яднанне хрысціянскай тэмы і айчыннай адчуваеш і ў «Песні пра ўваскрашэнне вершніка», што абвяшчае пра «ўваскрашэнне вершніка Пагоні» (123), і ў «Замове ад Курапат», дзе Бог «крыжам ля Менску злёг» (127), і ў вершы «У Сафіі крыж чырвоны». Апошні верш прысвечаны нацыянальнаму гістарычнаму помніку - Полацкаму Сафійскаму сабору, Сёння - свецкая ўстанова, але ў паэзіі змяніла белы колер на чырвоны, бо Маці Боская пакутуе - «у грудзёх-варганах / сэрца Маці Боскай гіне / ў крывавых ранах», пакутуе ад бязвер'я - «ды лятуць з бязвер'я гусі на крыж яе гостры» (126).

Здаецца, у такіх вершах гучыць нязгода з вядомымі караткевіцкімі паэтычнымі радкамі «На Беларусі Бог жыве». Бог ў паэзіі Сыса не жыве на Беларусі, а з'яўляецца зрэдку як знак, як сімвал духоўнасці. У паэта ёсць прамы зварот да караткевіцкга выразу ў вершы «Наступніку Уладзіміра Караткевіча», дзе духоўнасць, ці святасць, звязана з біццём сэрцаў, што адчуваецца толькі тады, калі «выплываюць паэты ў трунах», у галовах якіх «церні німбамі параслі» (131).

Гэтая ладдзя Паэтаў - своеасаблівы вобраз духоўнасці. Вобраз Паэта ў Сыса набывае рысы прарока, зноў жа не без міфалагічных фарбаў. Звяртаючыся да знакавых нацыянальных імёнаў, аўтар называе іх «беларускімі Ікарамі» (аднайменны верш, 121 - 122), «чарадой самотных птахаў», за якімі «вісельні ды плахі ды ўслед шпурнутыя глыжы» (129), божымі анёламі з беларускамоўнымі галасамі (107), званарамі і майстрамі храму душы (44). За вобразам «жабрака, бяздетнага Хрыста» праглядаецца постаць «цнатлівага князя» беларускай паэзіі Максіма Багдановіча (134 - 135). І сучаснаму Паэту наканавана насіць «цярновыя вершы» і выходзіць «насустрач сваёй Галгофе» («Данута Бічэль-Загнетава», 52), «бо пад небам Сафіі Полацкай / на народных паэтаў моляцца» (70).

Паэтычнае крэда паэта ў вершы з назвай «Паэт» трактуецца, як існаванне «боскай птушкі», той што чакае Бога, ногі Хрысту цалуе, слёзы ліе над жабраком, з «любай, як з маці, спіць» (137). Для адказу

на пытанне, дзе шукаць паэтычнае натхненне, аўтар выкарыстоўвае такі вобраз, як «крыж паэзіі», на якім паэт «бы крывёю», сыходзіць словам (верш «Натхненне» - 21). Пакуты Хрыстовы - пакуты паэтавы, Але «вечная пакутніца паэзія» нараджаецца з самога жыцця, з яго гора і радасці («Часта пытаюцца: як вершы пішуцца?...», 99).

Функцыю жа паэзіі аўтар удакладняе ў формуле «закалашы дзіця маімі вершамі... самымі добрымі і самымі лепшымі» (137). Або абвяшчае мераю паэзіі «важкасць спелых каласоў», а «не цнатлівасць кветак» (99). Каштоўнасць паэзіі вызначаецца новым, дабротным, будучым сэнсам чалавечага роду.

Ценню ідэальнага вобраза паэта з'яўляецца паэт-расстрыга (42), паэт-блудніца (22). У Сыса быццам бы два вобраза ў адной назве - паэт. З ідэальнага вобраза іншы раз выглядае грэшны чалавек або д·ябал. Здаецца, паэт кранае старую тэму - паэта-ізгоя. У беларускім літаратурным фальклоры ў ёй апісваецца музыка, як спалучэнне жабрацкага лёсу і таленту, гармоніі звычайнага і высокага, камічнага і трагічнага [3, с. 4].

Аднак ад фальклорнага разумення музыкі сучасны аўтар адыходзіць. Сыс не зможа падпісацца пад фальклорным купалаўскім выразам - «Я не паэта, о крый мяне Божа». Ён увесь час абвяшчае сябе паэтам, блудным сынам, расстрыгай, але паэтам. Трагічнае тут спалучаецца з такім відам камічнага, як сарказм, спецыяльная знявага сябе, мазахісцкі фарс. Адчуваецца адбітак сучаснаці. Ці не пра гэта піша крытык з нагоды аналізу лірычнага героя апошніх дзесяцігоддзяў XX стагоддзя: «Самотная постаць нашага сучасніка-ізгоя ў горадзе, блуднага сына на Бацькаўшчыне, напэўна, не такая ўжо і бяскрыўдная...» (4). Дарэчы, артыкул пра лірычнага героя сучаснай паэзіі называецца «Паміж небам і багнай». Тая ж калізія прысутнічае ў вершах Сыса, але тут тэма неба не проста духоўная чысціня ці нацыянальнае пачуццё, як у іншых аўтараў. Паэзія Анатоля Сыса - інтымная, шчырая, не абмежаваная ніякай іерархіяй (нецывілізаваная) размова з самім Богам.

У аўтара асаблівыя адносіны з Богам, вершы з хрысціянскай сімволікай звернуты да асабістага вопыту жыцця. «Неапаленая купіна» - верш, з якога пачынаецца апошні зборнік і жыццёвая словедзь паэта. У ім сімволіка асабістага нараджэння. Абраз «Неапаленай купіны» прысутнічае пры нараджэнні, як і вужака-маланка, і Пярун-пажар. Гэта - верш аб смерці і жыцці, аб прыгажосці і жудасці, аб Радзіме і аб маці. І над гэтым перапляценнем важкіх паняццяў гучыць: «І пачуў я ва ўлонні: з пакуты народзіцца Сын....» [2, с. 5]. Біблейскі сказ мае асабісты сэнс для паэта.

У амаль фальклорным апавяданні пра хрышчэнне аўтара знаходзіцца месца для містычнага знаку - згубілі малога і знайшлі гуляючага з крыжом, якз цацкаю («А я помню, як мяне хрысцілі...» - 133).

Зборнік «Ягамосць» уключае малітоўны верш «Перад Богам». Паўтараецца сімвалІчны рад нараджэння: маланка - пажар - малітва - Жанчына - маці. Тут тэма асабістых пакутаў - асноўная. І нараджэнне, як ачышчэнне ад граху, пажадана, як у малітве. Паэт, блудны сын, каіцца: «я гарэў, як бязбожны храм, / сам сабе я ў ім здаўся богам, /адпускаў сам сабе грахі - / грызла ганак вяла дарога / зноў на д'яблавыя кругі» (118).

Аўтар абвяшчае сябе блудным сынам («Блудны сын», 12), бадзягай (33), злодзеем, заблудшай цялушкай, адступнікам («Маналог адступніка», 39), расстрыгай («Маналог расстрыгі», 24). Але адначасова ён супрацьставіць сябе натоўпу, людзям як паляўнічы, «як той сабака», што пагібель чуе (129 - 130), як кволая птушка (33), як самотны («Самотны», 119), як камень, што не хоча быць здраднікам (41), як Радзіма (16), як Сонца (36). Супрацьлеглыя самахарактарыстыкі - процілеглыя эпітэты свету бога і знакаў д'ябла ў асобе чалавека. Аб гэтым і аўтарская споведзь: «хоць каханы, хоць ненавідны я - за сонцам і супроць сонца, я - прычына бяды і шчасця» (32 - 31), «у боскіх іскрах і ў шампанскіх пырсках, я яшчэ не попел» (128).

Паэзія Сыса - паэзія пакутаў, пошуку, адзіноты. Улюбёны жанр - маналог, вызначаны самім аўтарам у шэрагу назваў («Маналог Язэпа Драздовіча» (51), «Маналог Апанаса Філіповіча» (67), «Маналог Алеся Гаруна» (64), «Маналог Тутэйшага» (70 - 72), «Маналог Зміцера Жылуновіча» (101 - 102), «Маналог адступніка» (39) і інш.). Вобразы нараджаюцца хутка, быццам спяшаюцца (здаецца, іх зашмат на колькасць радкоў). Яны нараджаюцца хутчэй па метанімічнаму прынцыпу. Заканчваецца жа часта ўсё сентэнцыяй (амаль вульгарнай): «хто плюе на жанчыну - / той нелюдзь плюе на / Радзіму, / хто гандлюе святыняй - той маці сваю прадае» (5), - ці «бацькоўскай высновай»: «верай моцны народ!» (95). У падобных сентэнцыях ёсць тое, што, здаецца, павінна існаваць апрыоры і ніколі не змяніцца, як свет божы.

У самага неафіцыйнага паэта Анатоля Сыса - уся паэзія прасякнута хрысціянскімі матывамі. Эпатажныя паводзіны паэта ў жыцці адлюстраваны хрысціянскай пакорлівасцю паэтычнай думкі. У немаральнага па паводзінах аўтара - самыя шчырыя вершы, гэта - вершы пакаяння. Артыкул можна было б назваць - Пакаянне Анатоля ці Пакуты Анатоля. Можа гэта больш адпавядае жанравай сутнасці яго паэзіі, няроўнай ў фармальным выяўленні, але шчырай па сутнасці.

Эстэтыка паэзіі Сыса - новая-старая эстэтыка паэта-экзістэнцыяліста, паэта-рамантыка, паэта адраджэнскага тыпу, для якіх жыццё і вершы - адзінае. Гэта падкрэслена нават у назве апошняга зборніка, якая камусьці можа падацца нахабнай прэзентацыяй самога сябе. Назва зборніка - «Сыс», а на вокладцы

зборніка - сімвалічны здымак-калаж: два профілі паэта, які жорстка глядзіць на самога сябе. Двайныя партрэты былі вельмі распаўсюджаны ў Адраджэнні, бо мастака цікавіла сутнасць Чалавека, яго свет. І мастак тады ўяўляў сябе падобным Богу-Творцы. Яго, як і Ўсявышняга, натхняла Любоў і Творчасць. Але пачыналася ўсё з пазнання асабістых пачуццяў і спасціжэння асабістых магчымасцяў у свеце божым.

## ЛІТАРАТУРА

1. Насустрач духу: Анталогія беларускай хрысціянскай паэзіі / Уклад. І прадм. І.А. Чароты. - Мн.: Ураджай, 2001. -238 с.: іл.
2. Сыс: Вершы / Анатоль Сыс - Мн.: Маст. Літ., 2002 - 159 с. Далей цытаты з кнігі прыводзятся па гэтаму выданню з указаннем старонак ў круглых скобках.
3. Конан Ул. Універсальны сімвал творчасці і мастацкага генію // Мастацтва. - 1998. - № 10. - С. 2 - 3.
4. Гарэлік Л. Чалавек «Паміж небам і багнаю». Да характарыстыкі лірычнага героя ў сучаснай паэзіі // Полымя. - 2001. - № 4. - С. 290 - 308.